В процессе наблюдений за работой помощника воспитателя в группе, родителей дома в наведении порядка, детей заинтересовал вопрос о том, что такое пыль, как она появляется и как с ней бороться. На этой основе всё то, что его интересовало детей более подробно изучалось в условиях реализации исследовательского проекта. Сначала продумали тему совместной исследовательской работы — «Пыль. Что это?». Совместно с детьми выявить её актуальность, цель, гипотезу. Далее вместе с родителями было разработано содержание исследовательской работы и составлен план-схема её проведения. Потом начался сбор и изучение материала. На первом этапе осуществления исследовательского проекта определили сущность слова «пыль» и узнали, что это маленькие, сухие частицы, которые летают в воздухе или скапливаются на поверхности предметов. Учитывая проявленный познавательный интерес детей к маленьким частицам, провели опыты чтобы всё про них узнать. Экспериментальная деятельность включала следующие действия: вначале рассмотрели чистое стекло, обрамлённое рамкой, затем — под микроскопом, но ничего не увидели. Потом оставили его лежать на подоконнике два дня, рассмотрев, обнаружили, что оно стало серым. Используя микроскоп, увидели на стекле частички пыли и сделали вывод о том, что частички пыли очень маленькие и их можно увидеть только с помощью специального прибора. Второй этап был направлен на определение безопасности пыли для здоровья человека. Дети задавали вопросы по этому поводу родителям, друзьям, воспитателям, медицинской сестре в учреждении дошкольного образования. В процессе беседы с медицинской сестрой узнали, что пыль не безопасна и может вызвать ряд заболеваний. На этой основе у детей появился вопрос о частоте появления пыли и способах борьбы с ней. В домашних условиях совместно с родителями были проведены опыты, в ходе которых дети узнали, что пыль быстро появляется в таких местах, где мы её не видим. При этом родители рассказали детям о способах борьбы с пылью, а нами был разработан буклет «Как бороться с пылью?». На заключительном этапе результаты исследовательской работы нами были оформлены в виде презентации, так как в процессе проведения опытов мы оказывали необходимую помощь в подборе литературы, наглядного материала, делали выводы, умозаключения, обобщения. Впоследствии мы с детьми выступили на районном этапе конкурса исследовательских работ детей дошкольного возраста «Я — исследователь», где заняли первое место, а на областном этапе конкурса — третье место.

Следует отметить, что большой познавательный интерес к исследовательской деятельности был проявлен не только у детей, но и их родителей. Они ответственно отнеслись к исследовательской работе своих детей, помогали им во всём: изучать материал, проводить дома эксперименты, опыты, делать выводы, умозаключения. Трудностей по изучению материала у детей не было, потому что педагогические работники учреждения дошкольного образования тесно взаимодействовали с семьёй. В частности, оказывалась помощь в условиях учреждения дошкольного образования по изучению материала, а родители — дома.

В процессе этой деятельности нами были разработаны для воспитателей дошкольного образования консультации на темы: «Как организовать уголок экспериментальной деятельности для детей старшего дошкольного возраста», «Памятка для воспитателей при проведении опытов», «Планирование работы с детьми старшего дошкольного возраста по экспериментальной деятельности», «Оформление и содержание уголка экспериментирования в старшей группе».

**Заключение.** Таким образом, актуализация исследовательской деятельности в работе с детьми старшего дошкольного возраста способствует: развитию как познавательных интересов, так и творческой деятельности; проявлению самостоятельности в поиске, открытии и усвоении нового; расширению объёма представлений, полученных в ходе образовательного процесса, и приобщает к конкретным жизненно важным проблемам.

**Список цитируемых источников**


1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыіі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013. — 416 с.
2. *Никашина, Г. А.* Интеллектуально-творческое развитие детей дошкольного возраста: пособие для педагогов учреждений дошкольного образования с белорусским и русским языками обучения / Г. А. Никашина. — Минск : Нац. ин-т образования, 2014. — 167 с.


Репозиторий БарГУ

**УДК373.2.016**

**Н. В. Пралыгіна**
*Дзяржўная установа адукацыі «Мінскі гарадскі педагагічны каледж», Мінск*

## АРГАНІЗАЦЫЯ РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦЮ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ Ў РОЗНЫХ ВІДАХ ДЗЕЙНАСЦІ ВА ЎМОВАХ ЎСТАНОВЫ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

**Уводзіны.** Менавіта зараз, у сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму, праблеме фарміравання ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы надаецца значная ўвага як навукоўцамі, так і педагогамі-практыкамі. Адным са шляхоў удасканалення адукацыйнага працэсу ў дашкольнай установе па дадзенаму накірунку з'яўляецца рэалізацыя сістэмнага падыходу да арганізацыі работы па развіццю маўлення і культуры маўленчых зносін у розных відах дзейнасці. Значную ролю ў вырашэнні задач вучэбнай праграмы адукацыйнай вобласці «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» адыгрывае актыўнае выкарыстанне ў рабоце з дзецьмі твораў вуснай народнай творчасці. Беларускі народны фальклор — адзін з

© Пралыгіна Н. В., 2018.

найбольш эфектыўных сродкаў навучання рускамоўных дзяцей першапачатковым навыкам разумення беларускай мовы, узнаўлення пачутага, далучэння да беларускай культуры і нацыянальных традыцый.

**Асноўная частка**. Сутнасцю педагагічнай дзейнасці з'уляецца сістэма пакрокавай арганізацыі мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў адпаведнасці з пастаўленнымі мэтамі і задачамі, накіраванымі на работу з дзецьмі, з педагогамі, супрацоўніцтва з бацькамі. У аснове дзейнасці пакладзены прынцыпы комплекснасці і інтэграцыі. Адпаведна ім адукацыйны працэс разглядаецца як адзіная цэласная сістэма, у якой выкарыстоўваюцца розныя формы работы з усімі суб'ектамі адукацыйнага працэсу і якая дазваляе забяспечваць мэтанакіраванае ўзаемадзеянне педагогаў дашкольнай установы, сям'і і соцыум. Дадзеная сістэма ствараецца на аснове аналіза існуючых умоў у дашкольнай установе, на аналізе вынікаў дыягнастычнага даследвання развіцця беларускага маўлення і пазнання навакольнага асяроддзя ў дзяцей дашкольнага ўзросту, на высновах анкетавання педагогаў і бацькоў.

Павысіць узровень сфарміраванасці камунікатыўных якасцей маўленчай дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту падчас розных відаў дзейнасці дапаможа добра наладжаная сістэма мерапрыемстваў, у аснове якой пакладзены прынцып комплекснасці і інтэграцыі, праз практыка-арыентаваныя метады, улічваючы асноўныя накірункі: работа з дзецьмі, педагогамі, супрацоўніцтва з бацькамі, узаемадзеянне з соцыўмам. Комплексны і інтэграваны характар работы педагагічнага калектыва робіць працэс мэтанакіраваным і сістэмным і дазваляе дасягнуць пастаўленай мэты: павысіць якасць адукацыйнага працэсу развіцця маўлення і фарміравання камунікатыўных якасцей маўленчай дзейнасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту.

Алгарытм арганізацыі дзейнасці складаецца з трох этапаў, кожны з якіх мае сваю мэту, змест і чакаемы вынік. Змест дзейнасці рэалізуецца ў адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі сістэмнага падыходу: паслядоўнасці, пераемнасці, узаемасувязі. Першапачаткова важна накіраваць дзейнасць на стварэнне комплекса ўмоў: арганізацыйных, інфармацыйна-метадычных, кадравых, матывацыйна-псіхалагічных, якія забяспечаць якасць дзейнасці.

Адкрыццё ў дашкольнай установе міні-музея «Беларуская хатка» — адна са значных умоў дадзенай сістэмы. Сумесная дзейнасць педагогаў і бацькоў па збору экспанатаў ў міні-музей «Беларуская хатка», афармленение пашпарта музея, распрацаванне матэрыялу для работы з дзецьмі (гутарак, экскурсій, заняткаў) пашырае і ўдасканальвае магчымасці арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Інфармацыйна-метадычны кабінет — скарбонка сістэматызаванага па раздзелах «Дзіця і грамадства», «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» практычнага матэрыялу з выкарыстаннем твораў вуснай народнай творчасці. У ім арганізуюцца выставы метадычных дапаможнікаў, размяшчаецца каталог метадычнай літаратуры і перыядычных выданняў, матэрыял для самаадукацыі педагогаў.

Метадычнае суправаджэнне дзейнасці педагагічных работнікаў на дадзеным этапе дазваляе: стварыць ўмовы па арганізацыі пазнавальнай дзейнасці дзяцей, па авалоданні даступным аб'ёмам ведаў, па фарміраванні ў іх эмацыянальна станоўчых адносін да заняткаў такога роду; падабраць аб'екты, пра якія варта расказаць дзецям , улічваючы іх узроставыя асаблівасці; вызначыць аб'ём і змест ведаў, якімі неабходна авалодаць кожнаму выхаванцу групы ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі; размеркаваць пазнавальны матэрыял такім чынам, каб дзеці на працягу ўсяго года засвойвалі веды паступова, у пэўнай сістэме, скласці перспектыўна-тэматычны план.

Створаныя ўмовы з'яўляюцца базавай асновай для распрацоўкі канспектаў заняткаў, сцэнарыяў свят, забаў, тэматычных тыдняў, з актыўным уключэннем твораў вуснай народнай творчасці ў змест розных форм работы з дзецьмі, арганізацыі розных відаў дзіцячай дзейнасці на працягу беларускамоўнага дня, арганізацыі сумеснай дзейнасці дзіцячага сада, сям'і, соцыума.

Улічваючы, што дашкольны ўзрост — спрыяльны перыяд у жыцці дзіцяці, калі фарміруецца цікавасць і патрэба да ведаў, а вядучым відам дзейнасці з'яўляецца гульня, адукацыйны працэс па развіццю маўлення дзяцей носіць гульнёвы характар з апорай на творы вуснай народнай творчасці і дзіцячай мастацкай літаратуры.

Галоўная мэта работы з дзецьмі — развіццё маўлення і культуру маўленчых зносін; выхаванне пачуцця гонару і павагі за сваю Радзіму, за свой народ, яго мову, гісторыю, культуру.

Практыка паказвае, што выніковасць заняткаў па развіцці маўлення і культуры маўленчых зносін вызначаецца своеасаблівай структурай. Змест дадзенай структуры складаеца з эфектыўных метадаў і прыёмаў работы: сюрпрызны момант, разгляд карцін, праслухоўванне верша, запрашэнне ў падарожжа, праблемная сітуацыя, гульнявыя прыёмы («пытаю — адказвай», «закрый вочы і ўяві», «зазірні ў канверт», «складзі з частак» і г.д.); творчыя заданні («намалюй і раскажы, што ўявіў», «прыдумай сам», «упрыгож словам»), віктарыны, выкарыстанне прыказак, прымавак для разважання па іх змесце, малых форм беларускага народнага фальклора для арганізацыі дынамічнай хвілінкі, замацавання правільнага вымаўлення слоў; праслухоўванне музычных твораў. Загадкі як форма фальклорнай творчасці дапамагаюць увесці дзяцей у навакольны свет, развіць фантазію, прымушаюць думаць. Вершы садзейнічаюць стварэнню атмасферы шчырасці, даверу ў гутарках пра маці, прыроду, Радзіму. Выкарыстанне на занятках метада «дзевяціэкранка» дазваляе актывізаваць моўную дзейнасць і развіваць лагічнае мысленне. Творчыя хатнія заданні («спытай у бабулі», «схадзі на экскурсію», «прачытайце разам з бацькамі і вывучы»), таямнічае паведамленне пра тэму наступнага занятка зацікавіць дзяцей, заахвоціць працягнуць дзейнасць.

Заняткі ў форме гульнявых праблемна-павучальных сітуацый ператвараюць дзяцей у настаўнікаў, што дазваляе кожнаму дзіцяці развіваць камунікатыўныя здольнасці, актывізаваць мову, праявіць сябе ў дзейнасці.

Форма падарожжа з выкарыстаннем бінокляў, фотаапаратаў заахвоціць дзяцей да адлюстравання тэмы занятка ў маляванні, лепцы, аплікацыі, тым самым робіць дзейнасць інтэграванай («Вандроўка з буслам па роднай Беларусі», «Птушкі спяваюць, ў госці вясну запрашаюць»).

Рэпазіторый БарДУ

Мультымедыйныя прэзентацыі («Покліч мінулых стагоддзяў: Рагнеда», «Хай гукі прыроды не сціхаюць», «Ефрасіння Полацкая») спрыяюць пашырэнню ведаў, робяць працэс азнаямлення цікавым і больш запамінальным.

Азнаямленне дзяцей з беларускімі народнымі традыцыямі, побытам, прыладамі працы, эфектыўна ажыццяўляецца праз гутаркі-разважанні па казкам, карцінам, выкарыстанне загадак, забаўлянак, гульняў, лічылак на інтэграваных занятаках ў спецыяльна створаным прадметна-развіваючым асяроддзі (у міні-музеі «Беларуская хатка», «На выставе майстроў» і г. д.)

Акрамя заняткаў, эффектыўнымі формамі па пашырэнні ведаў дзяцей аб народных традыцыях, гісторыі з'яўляюцца тэматычныя вечарыны («На вячоркі да бабулі Алены»), віктарыны («Зямля пад белымі крыламі»), кірмашы («Кірмаш здароўя»), сумесныя з бацькамі святы («А мы жата жалі», «Каляды»), мэтавыя прагулкі (да помнікаў, па вуліцах горада), гутаркі, сумесная дзейнасць з бацькамі па складанні рукапісных альбомаў («Беларускія народныя загадкі» з дзіцячымі малюнкамі), фотаальбомаў («Наш горад»), творчае заданне «Скласці расказ пра цікавыя помнікі, пра вуліцу», сумеснае чытанне часопіса «Вясёлка», экскурсіі па знакамітых мясцінах роднага краю. Арганізацыя на базе дашкольнай установы выяздных выстаў вырабаў народнага мастацтва з саломы і дрэва Нацыянальнага музея гісторыі і культуры, паказ дзецям спектакля паводле беларускіх народных казак Беларускім нацыянальным тэатрам лялек дазволяюць ажыццявіць узаемасувязь з соцыумам.

Дадатковая арганізацыя творчых заняткаў у гуртку па інтарэсах «Вясёлка» на аснове перспектыўнага планавання з дзецьмі 3—6 гадоў, дазваляе паглыбіць веды выхаванцаў, развівае іх творчыя здольнасці ў час тэатральна-гульнявай дзейнасці заснаванай на творах вуснага народнага фальклора.

Заняткі, арганізаваныя ў гуртку па інтарэсах «Крынічка», дапамагаюць музычнаму кіраўніку паглыблена развіваць пеўчыя здольнасці дзяцей старшага дашкольнага ўзросту, выкарыстоўваючы сродкі вуснага народнага фальклору.

У межах дзейнасці ў гэтым накірунку асноўная ўвага надаецца арганізацыі актыўнага супрацоўніцтва з бацькамі. Пазнаёміцца з патрабаваннямі сям'і па развіцці маўлення і культуры маўленчых зносін магчыма з дапамогай анкетавання, індывідуальных гутарак. Атрыманыя вынікі ўлічваюцца пры складанні перспектыўнага плана з уключэннем розных форм і метадаў ўзаемадзеяння з бацькамі: наглядных, славесных, калектыўных і індывідуальных, з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Асноўная перавага аддаецца арганізацыі актыўных форм: сумесныя мерапрыемствы ў клубе «Сямейная гасцёўня», святы з элементамі фальклору для дзяцей з удзелам бацькоў («Святкуем Каляды разам з бацькамі»), мастацка-пазнавальныя віктарыны для бацькоў і дзяцей старэйшай групы («Зямля на далоні»), спартыўныя святы з элементамі фальклора для дзяцей старэйшай групы і бацькоў («Кірмаш здароўя»), далучэнне бацькоў да ўдзелу ў творчых конкурсах, праектнай дзейнасці («Беларусь — мая Радзіма», «Радавое дрэва», «Беларуская нацыянальная страва», «Беларуская лялька-абярэг»).

**Заключэнне.** Створаная сістэма работы дае магчымасць педагогам фарміраваць ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўстойлівую цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы, раскрываць творчыя магчымасці дзіцяці, фарміраваць цікавасць да народнай творчасці, у гульнёвай форме далучаць дзяцей да нацыянальнай культуры, фарміраваць нацыянальную самасвядомасць.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мн. : НІА ; Аверсэв, 2013. — 406 с.
2. *Грымаць, А. А.* Народная педагогіка беларусаў : метад. дапам. / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. — Мн. : Скакун, 1999. — 255 с.
3. *Дубініна, Дз. М.* Выкарыстанне сродкаў народнай педагогікі ў развіцці маўлення дашкольнікаў / Дз. М. Дубініна. — Мн. : [б. в.], 1996. — 92 с.
4. *Старжынская, Н. С.* Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў / Н. С. Старжынская., Дз. М. Дубініна. — Мазыр, 2009. — 301 с.



**УДК 373.2**



**Л. А. Пшеницына**
*Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж», Минск*


## ОСНОВНЫЕ КОМПЕТЕНЦИИ ПЕДАГОГА В ПРОЦЕССЕ ФОРМИРОВАНИЯ ГУМАНИСТИЧЕСКИХ ОТНОШЕНИЙ ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

**Введение.** На современном этапе развития общества проблема гуманистических отношений личности ко всему живому в пространстве ноосферы является весьма важной, так как жизнедеятельность нового поколения проходит в совершенно новых условиях технологизационных процессов. Всё вышесказанное актуализирует проблему подготовки педагогов дошкольного образования, повышения их профессиональной компетентности и составляющих её компетенций, направленных на обеспечение гармоничного социально-нравственного развития ребёнка в общем и, в частности, на формирование гуманистических отношений с различными субъектами и объектами окружающего мира.

**Основная часть.** Для рассмотрения основных компетенций педагога в процессе формирования гуманистических отношений воспитанника необходимо использование компетентностного подхода. В отечественных и зарубежных исследованиях (А. Л. Андреев, В. А. Болотов, А. В. Бондаревская, А. Г. Бермус, И. А. Зимняя,


© Пшеницына Л. А., 2018.





Репозиторий БарГУ